УДК 75.03/05[20]

***Т. І. Васюк,***
*дацэнт, дацэнт кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# МАСТАЦКАЯ АДУКАЦЫЯ Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ: ЗАХАВАННЕ ТРАДЫЦЫЙ І ПОШУК НОВЫХ ШЛЯХОЎ У ПАЧАТКУ XXI ст.

**Анатацыя.** Разглядаецца мастацкая адукацыя ў Беларусі ў пачатку XXI ст., прыярытэтныя напрамкі ў выяўленчай мастацкай школе: класічны, акадэмічны, эксперыментальны і інш., як працяг моцнага творчага штуршка XX ст.

**Ключавыя словы:** акадэмічнасць, класіка, «Чорны квадрат», мастацкая школа, прыярытэт, шлях.

***T. Vasyuk,***
*Associate Professor, Associate Professor of the Department of Decorative and Applied Arts of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts"*

# ART EDUCATION IN THE FIELD OF CULTURE OF BELARUS: PRESERVING TRADITIONS AND SEARCHING FOR NEW WAYS AT THE BEGINNING OF THE XXI CENTURY

**Abstract.** The article considers art education in Belarus at the beginning of the 21st century, priority areas in the art school: classical, academic, experimental, etc., as a continuation of a strong creative impulse of the 20th century.

**Keywords:** academicity, classics, square, art school, priority, path.

Цікава адзначыць, што гісторыка-тэарэтычнае даследаванне ў мастацкай адукацыі з’явілася не так даўно, хаця адукацыйная сістэма існуе шмат часу. Адбываецца пошук заканамерных узаемазвязаных праграм сярэдніх, сярэдніх спецыяльных і ўстаноў вышэйшай адукацыі. Сінтэз вывучэння спецыяльных і тэарэтычных дысцыплін фарміруе і ўдасканальвае выхаванне творчай асобы, якая прызначана працаваць дзеля будучыні.

Адзначым, што да канца XX ст. у краіне сфарміравалася сталая акадэмічная школа мастацкай адукацыі: Беларуская

дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, а таксама шэраг сярэдніх спецыяльных мастацкіх установ і аддзяленняў пры Віцебскім педагагічным універсітэце, Гродзенскім і Брэсцкім універсітэтах і інш. Гэта шырокая сетка спецыялізаваных устаноў выхоўвае для краіны кадры, здольныя працягваць традыцыі Віцебскай мастацкай школы, якая і па сённяшні дзень застаецца вядучым прыкладам творчасці ў многіх відах мастацтва (у тым ліку, у дызайне). Віцебская мастацкая школа вызначыла шлях, накіраваны ў Новы час. Яе наватарства плённа выкарыстоўваецца айчыннымі і замежнымі мастакамі і мастацтвазнаўцамі ў развіцці і аналізе розных кірункаў творчасці.

Напрыканцы XX і ў пачатку XXI ст. па выніках некаторых выставак маладых творцаў заўважана аддаленне ад класічнай і традыцыйнай школы мастацтва і мастацкай адукацыі. Новы час, безумоўна, патрабуе новых форм асэнсавання. Адбываецца пошук, без якога не існуе мастацтва. Варта адзначыць, што гэтыя высілкі дзяржава апякуе: дваццаць сем гадоў таму ідэю стварэння Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі горача вітаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Шматлікія выстаўкі і конкурсы вызначылі лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў сярод трох узроставых груп таленавітай моладзі. У 1997 г. у складзе старшай групы фондам адзначаны студэнты кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў – Уладзімір Жахавец, Андрэй Шабар, Максім Данільчанка і інш.

Актыўны ўдзел у разнастайных выстаўках і конкурсах назіраецца ў нашых студэнтаў і па сённяшні дзень. Пераможцамі робяцца керамісты, тэкстыльшчыкі і пляцельшчыкі з саломы і лазы. Спецыфіка мастацкай творчасці вельмі шматгранная, вобразная сістэма і майстэрства юных талентаў захапляе. Будучыня беларускага мастацтва фарміруецца ў сённяшнім дні. Напрыклад, традыцыя ў кераміцы адметна загучала ў руках маладых прадстаўнікоў сучаснага мастацтва. Мініяцюрныя пасудзіны з гліны набылі каштоўнае гучанне. Лепшае мастацкае традыцыйнае аздабленне атрымаў наватарскі кірунак у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Маладыя майстры Кастусь Цітоў, Дзяніс Гром, Максім Данільчанка, Алег Ткачоў,

Уладзімір Маторaў і іншыя керамісты вынікамі сваёй плённай працы занялі годнае месца ў гісторыі кафедры і ўніверсітэта.

Але майстэрства і творчасць маюць няпростыя адносіны. Калі няма прыроднага таленту, адны навыкі наўрад ці дапамогуць. На думку аўтара, тое самае тычыцца і мастацкай адукацыі: навучыць маляваць, ляпіць, майстраваць можна толькі ўласным важкім прыкладам. На ўвесь пасляваенны перыяд і да сённяшняга часу залатымі літарамі ў гісторыю выкладання мастацтва ўпісаны імёны каля трох дзясяткаў выбітных творцаў, што адначасова мелі педагагічны талент. Самыя дасканалыя праграмы і метадычныя дапаможнікі даюць кірунак у творчасці, а тонкія рысачкі прафесіяналізму вызначае менавіта майстар-педагог, які адначасова спалучае методыку выкладання і майстэрства, арыентуючы вучняў на творчы шлях дасканаласці і гармоніі. Сярод іх Валянцін Пятровіч Пакаташкін (1940–2022), мастак-жывапісец, які выхаваў і падрыхтаваў да паступлення ва ўстановы мастацкага профілю звыш тысячы вучняў, арганізаваўшы пры Гомельскім Палацы піянераў і школьнікаў студыю выяўленчага мастацтва. Майстар знаходзіўся і ў вытокаў стварэння Гомельскага мастацкага вучылішча.

Гэта і Васіль Пятровіч Шаранговіч (1939–2021) – былы рэктар БДТМІ, мастак-графік, што стварыў школу беларускай графікі і выхаваў плеяду выдатных мастакоў.

У слынным шэрагу і Гаўрыіл Харытонавіч Вашчанка (1928–2014), колішні загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва БДТМІ, мастак-монументаліст, нацыянальны гонар. У свой час ён уваходзіў у склад савета Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Гэта быў выдатны мастак і педагог з вышэйшым тактам і сілай творчай энэргіі, які мог разгледзець у маладых творцах іх патэнцыял і беспамылкова вызначыць ступень адоранасці кожнага, пранікаючыся іх дасягненнямі.

Хочацца азначыць паспяховасць айчыннай мастацкай адукацыі, што выхавала дзясяткі творчых асоб, якімі ганарыцца Беларусь: В. Цвірка, А. Глебаў, В. Шаранговіч, А. Анікейчык, Л. Шчамялёў, З. Азгур, А. Бембель, А. Савіцкі. Кожны з іх атрымаў розную адукацыю, але яе акадэмічная база дала майстрам пэндзля і разца сілы для раскрыцця таленту.

У XXI ст. асноўным напрамкам з'яўляюцца тэхнаарт і іншыя камп'ютэрныя варыяцыі, але шматлікія творы мастацкай графікі, жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва сведчаць пра шматгранную дзейнасць творчай моладзі.

Такім чынам, адукацыйная сістэма Беларусі застаецца прыярытэтным напрамкам развіцця грамадства. Значная ўвага надаецца развіццю культуры і мастацтва. Адукацыя ў сферы культуры стварае ўмовы для рашэння наватарскіх задач у эксперыментальна-творчым кірунку, захоўваючы традыцыі, напрацаваныя ў ХХ ст.

УДК 788.5/.8

***В. М. Волоткович,***
*доцент, заведующий кафедрой духовой музыки*
*учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

# АНАЛИЗ ПАРТИТУР КАК ВАЖНАЯ ЧАСТЬ ДИРИЖЕРСКОЙ ПРОФЕССИИ

**Аннотация.** Рассматриваются разновидности симфонических и духовых оркестров, их составы, изучение и анализ партитуры как важнейшей части дирижерской профессии. Уделяется внимание основным типам эстрадных оркестров – бенду и симфоджазу, а также освоению партитуры, что предполагает владение значительным кругом вопросов и требует большой работы, помощь в которой оказывают знания в области инструментоведения, музыкальных форм, истории музыки. Освещается процесс подробного и всестороннего изучения музыкального произведения для оркестра или ансамбля с помощью фортепиано, в результате которого можно получить цельное и достаточно точное представление о его реальном звучании и художественном содержании.

**Ключевые слова:** разновидности и составы симфонических оркестров; освоение партитуры, дирижерской профессии, духового искусства; эстрадные оркестры, бенд, симфоджаз, анализ партитуры, инструментоведение, анализ музыкальных форм, история музыки, чтение партитур, изучение музыкального произведения, оркестр, фортепиано; звучание и художественное содержание произведения.